Шыфр:____________________________

Колькасць балаў:_______________

Месца:___________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

______________Р.С. Сідарэнка

«16» сакавіка 2016 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Полацк, 2016 г.*

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** Прывядзіце па два прыклады слоў або спалучэнняў самастойных слоў са службовымі, у якіх літара ***с*** абазначае гукі [***с'***], [***з'***], [***ш***], [***з***].

*Максімальная колькасць балаў – 4*
(0,5 бала – за кожны правільна прыведзены прыклад).

1) с = [***с'***]: ____________________________________________
2) с = [***з'***]: ____________________________________________
3) с = [***ш***]: ____________________________________________
4) с = [***з***]: ____________________________________________

**Заданне 2.** Вызначце, якое агульнае слова-кампанент прапушчана ў наступных фразеалагізмах:

1) *накруціць ...* ;
2) *цягнуць ката за ...* ;
3) *трымаць ... трубой*;
4) *круціць вала за ...* ;
5) *як авечы ...* ;
6) *вісець на ...* .

Упішыце фразеалагізмы ў табліцу ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 6*
(1 бал – за кожны правільна ўпісаны ў табліцу фразеалагізм).

| Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|
| | ‘вельмі моцна (калаціцца, трэсціся і пад.)’ |

| | |
|---|---|
| | ‘даганяючы ці гонячы каго-небудзь, ісці, рухацца следам за ім)’ |
| | ‘трымацца ўпэўнена, з гонарам, не баючыся, не сумуючы’ |
| | ‘зрабіць строгую вымову, паўшчуваць’ |
| | ‘бязмэтна праводзіць час’ |
| | ‘нудна, аднастайна гаварыць, марудзіць з адказам, выклікаючы ў каго-небудзь раздражненне’ |

**Заданне 3.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце яго ўласнымі прыкладамі словазлучэнняў (сказаў) з назоўнікамі ў форме творнага склону ў адпаведнасці з прыведзенымі граматычнымі значэннямі (па адным прыкладзе на кожнае значэнне).

*Максімальная колькасць балаў – 5*

(1 бал – за кожнае правільна падабранае словазлучэнне або сказ).

Творны склон назоўніка выражае розныя граматычныя значэнні. ***Творны склон аб'екта*** паказвае на прадмет у яго адносінах да дзеяння: *узнагародзіць медалём*, ______________________________. ***Творны склон інструментальны*** паказвае на прыладу, з дапамогай якой ажыццяўляецца дзеянне: *араць трактарам*, ______________________________. ***Творны склон параўнання*** паказвае на спосаб дзеяння ці характар яго здзяйснення: *ляцець куляй*, ______________________________. ***Творны склон прыметы*** паказвае на пасаду, становішча, уласцівасць, якія ствараюцца не самой асобай, а кімсьці іншым: *Мішу прызначылі старастам* ______________________________. ***Творны склон прэдыкатыўны*** выступае іменнай часткай састаўнога выказніка пры дзеясловах-звязках: *Пеця быў выдатнікам*; ______________________________
(Паводле «*Слоўніка лінгвістычных тэрмінаў*».)

**Заданне 4.** Вызначце, як утварыліся прыдаткі да назваў свят і прысвяткаў беларускага народнага календара.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

(0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0,5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

| Назва | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|
| Узор: 24.04 – *Анціп-іхоўнік* | <u>іхоў</u>*ва(ць) + нік(□)* | суфіксальны |
| 6.02 – *Аксіння-паўзіміца* | | |
| 17.03 – *Герасім-гракоўнік* | | |
| 14.07 – *Кузьма-сякач* | | |
| 14.09 – *Сямён-летаправодзец* | | |

| | |
|---|---|
| 5. Вось пра што падумалася, чытаючы гэту кнігу: біяграфія Алеся Савіцкага сама па сабе нібыта легенда… | |

**Заданне 7.** Пасяваем?

_________ (?) ды Грышка ладзілі дуду –
Павесяліцца ды прагнаць нуду.
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ды прагнаць нуду.

А як звалі яшчэ аднаго вясёлага дудара? Запішыце беларускую афіцыйную (дакументальную) форму асабовага імя гэтага музыкі і вытворныя ад яго формы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________

**Заданне 8.** У кожным з прапанаваных радоў адзін элемент будзе лішнім. Запішыце, што тут лішняе і патлумачце чаму.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1**. Амфібрахій, анапест, харэй, дактыль.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________
______________________________________________________________________________

**2**. Раман, байка, аповесць, апавяданне.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________
______________________________________________________________________________

**3**. Барока, Сярэднявечча, класіцызм, мадэрнізм.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________
______________________________________________________________________________

**4**. Эпітэт, рытарычны зваротак, інверсія, бяззлучнікавасць.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________
______________________________________________________________________________

**5**. Тэма, ідэя, праблема, троп.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________
______________________________________________________________________________

| | |
|---|---|
| 5. Вось пра што падумалася, чытаючы гэту кнігу: біяграфія Алеся Савіцкага сама па сабе нібыта легенда… | |

**Заданне 7.** Паспяваем?

_________ (?) ды Грышка ладзілі дуду –
Павесяліцца ды прагнаць нуду.
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ду ду ду ду
Ды прагнаць нуду.

А як звалі яшчэ аднаго вясёлага дудара? Запішыце беларускую афіцыйную (дакументальную) форму асабовага імя гэтага музыкі і вытворныя ад яго формы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8.** У кожным з прапанаваных радоў адзін элемент будзе лішнім. Запішыце, што тут лішняе і патлумачце чаму.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. Амфібрахій, анапест, харэй, дактыль.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________

______________________________________________

2. Раман, байка, аповесць, апавяданне.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________

______________________________________________

3. Барока, Сярэднявечча, класіцызм, мадэрнізм.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________

______________________________________________

4. Эпітэт, рытарычны зваротак, інверсія, бяззлучнікавасць.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________

______________________________________________

5. Тэма, ідэя, праблема, троп.

Лішняе ____________________, бо ______________________________________

______________________________________________

**Заданне 9.** Пазнайце на партрэце беларускага пісьменніка і ў адпаведным радку напішыце яго псеўданім ці сапраўднае імя. Пад кожным партрэтам напішыце нумары тых гісторыка-літаратурных рэалій, якія адносяцца да жыцця і творчасці гэтага пісьменніка.

***Увага!*** Сярод пераліку гісторыка-літаратурных рэалій ёсць "лішнія", што не адносяцца да жыцця і творчасці пісьменнікаў, чые партрэты прадстаўлены ў заданні.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
| Гэта ________________ | Гэта ________________ | Гэта ________________ |
| ________________ | ________________ | ________________ |
| Да яго жыцця і творчасці адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да яго жыцця і творчасці адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да яе жыцця і творчасці адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: |
| ________________ | ________________ | ________________ |

**Пералік гісторыка-літаратурных рэалій:**

1) месца нараджэння – горад Орша;
2) сярод літаратурных псеўданімаў – Гаўрыла з Полацка, Тымчасовы;
3) аўтар зборнікаў вершаў "Строма", "Трысцё", "Credo", "Наля";
4) першы надрукаваны твор – абразок "Пяюць начлежнікі";
5) аўтар аповесці "Салавей", рамана "Язэп Крушынскі";
6) вышэйшая адукацыя атрымана ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі;
7) аўтар казкі "Лебядзіны скіт";
8) заснавальнік першай Мінскай беларускай друкарні;
9) аўтар вершаў "Вера беларуса", "Суседзям у няволі", "Мае думкі";
10) месца нараджэння – горад Полацк;
11) месца нараджэння – вёска Пасадзец, што на Міншчыне;
12) вольны слухач філасофскага факультэта Львоўскага ўніверсітэта.

**Заданне 10.** Прачытайце верш Янкі Сіпакова "Ялта, Максім, кіпарысы" і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак на магільніку гарыстым
Ён навучыў, здаецца, гаварыць.
Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, нібыта прысак...
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

| | |
|---|---|
| **1**. Назва цвёрдай формы верша, выкарыстанай Янкам Сіпаковым. | |
| **2**. Памер, якім напісаны пяты радок верша. | |
| **3**. Тып рыфмоўкі ў першых чатырох радках. | |
| **4**. Найбольш верагодны прататып Максіма, пра якога ідзе гутарка ў вершы. Абгрунтуйце свой адказ. | |